# ВВЕДЕНИЕ

Маладзёжная палітыка ў сучаснай Беларусі набывае асаблівы імпульс развіцця, абумоўлены стратэгічным значэннем вырашаемых ёю задач. Найважнейшай рысай маладзёжнай палітыкі становіцца адпаведнасць яе зместу дзяржаўна-грамадскім інтарэсам па фарміраванню ў маладога пакалення установак на самаразвіццё, самарэалізацыю і самазабеспячэнне. У гэтай сувязі дзяржаўнымі структурамі і грамадскімі аб’яднаннямі, якія задзейнічаны ў галіне рэалізацыі маладзёжнай палітыкі, мэтанакіравана ствараюцца адаптыўныя ўмовы і акумулююцца рэсурсы, каб спрыяць развіццю суб'ектных якасцяў ў разнастайных груп моладзі. Актуалізацыя інтэлектуальных, прафесійна-працоўных, дэмаграфічных, сацыякультурных, асобасных патэнцыялаў маладых людзей – стане вынікам узаемазлучанай дзейнасці ў галіне маладзёжнай палітыкі.

Пераходны характар маладосці як пераломнага этапу ў працэсе сацыялізацыі чалавека, а таксама сацыяльная неаднароднасць моладзі вызначаюць патрэбу юнакоў і дзяўчат у дапамозе і падтрымцы, саўдзеле і садзейнічанні, сацыяльным уключэнні і суправаджэнні. Маладзёжная палітыка развівае дзяржаўна-грамадскую сістэму суб'ект-суб'ектных і суб'ект-аб'ектных адносін з моладзевай суполкай, фарміруе ўласную інфраструктуру, ствараючы ўмовы для працы ў моладзевым асяроддзі.

Сучасная моладзь як самая дынамічная супольнасць валодае значнымі інавацыйнымі магчымасцямі, пастаянна асвойвае featureнавектарныя траекторыі сацыялізацыі, арганічна ўваходзячы ў шматсуб’ектную прастору пастаянна змяняючайся сацыяльнай рэчаіснасці. У той жа час становіцца відавочным, што асаблівасці сацыяльнага развіцця маладых людзей спалучаюцца з шырокім спектрам цяжкасцей і праблем, якія існуюць ў моладзевым асяроддзі. У сувязі з гэтым, у кантэксце дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі маладое пакаленне разглядаецца не толькі як суб'ект самастойнай жыццядзейнасці, але і як аб'ект сацыяльных інвестыцый у выглядзе дзяржаўных мер падтрымкі і суправаджэння, уключаючы грамадзянскія і грамадскія дзеянні і ініцыятывы.

Рэалізацыя сучаснай маладзёжнай палітыкі ўключае шматфункцыянальную дзейнасць, якая ўлічвае патрэбы і садзейнічае самарэалізацыі юнакоў і дзяўчат у шырокім спектры сацыяльна значных пытанняў жыццядзейнасці: прафесійнай і дадатковай адукацыі; працы, кар'еры і матэрыяльнага забеспячэння; здароўя і здаровага ладу жыцця; сям'і; асабістага жыцця; спорту; вольнага часу; камунікацый; бяспекі. У адпаведнасці з гэтым у праекце Стратэгіі развіцця вылучаецца сем прыярытэтаў дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, якія суадносяцца з асноўнымі сферамі жыццядзейнасці моладзі і прадстаўляюць асаблівую каштоўнасць для маладых людзей: адукацыя, праца, здароўе, сям'я, вольны час і творчасць, грамадскі ўдзел, бяспечнае асяроддзе.

Шматаспектнасцю і шматфункцыянальнасцю задач абумоўлена неабходнасць рэалізацыі прынцыпаў міжсектаральнага супрацоўніцтва; рэальнага, а не дэкларатыўнага міжведамаснага ўзаемадзеяння з мэтай кансалідацыі намаганняў усіх суб'ектаў дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Варта адзначыць, што названыя прынцыпы цяжка рэалізуюцца ў рамках дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка», дзе задачы, інструменты і сродкі рэалізацыі вымушана карэлююць з адукацыйнымі стратэгіямі і не ў поўнай меры адлюстроўваюць спецыфіку работы з моладдзю ўсіх узроставых катэгорый, уключаючы працуючую моладзь. Шырокае грамадскае абмеркаванне праблематыкі развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, прапановы, сфармуляваныя ў працэсе абмеркавання, дазволяць, на наш погляд, прыняць якасна новы эфектыўны нарматыўны дакумент.

Вашай увазе прадстаўлены матэрыялы ўдзельнікаў канферэнцыі “Маладзёжная палітыка Рэспублікі Беларусь: стратэгічныя падыходы і рашэнні” па накірункам, выдзеленым у гэтым нарматыўным дакуменце. Гэта ўсяго невялікая частка вынікаў і прапаноў, якія былі

выпрацаваны ў ходзе шырокага грамадскага абмеркавання праекта Стратэгіі развіцця дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь да 2030 года.

*Л.С.Кажухоўская*
*прарэктар па міжнароднай і навукова-метадычнай рабоце*
*Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы*